**23.** Вызначце з дадзеных словы, якія ўтвораны прыставачна-суфіксальным спосабам:

*1) ацалець; 2) па-іншаму; 3) велічыня; 4) дзе-небудзь.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**24.** Большасць даследчыкаў літаратуры лічаць, што складальнікам «Аповесці мінулых гадоў» з'яўляецца … .

**А)** Кірыла Тураўскі. **Б)** Усяслаў Чарадзей. **В)** Еўфрасіння Полацкая.
**Г)** Мяфодзій. **Д)** Нестар.

**25.** Вызначце словы, напісанне якіх заснавана на марфалагічным прынцыпе:

*1) мядзведзь; 2) пясчаны; 3) суседскі; 4) нясвіжскі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 4. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**26.** Што напісана пад гравюрным партрэтам Францыска Скарыны?

**А)** імя і прозвішча. **Б)** імя і прозвішча, дзень і год нараджэння.
**В)** імя і прозвішча, год і месца нараджэння.
**Г)** імя і прозвішча, вучоная ступень. **Д)** прозвішча.

**27.** ***Агіяграфія*** – гэта … .

**А)** від хрысціянскай літаратуры, у якой апісваецца жыццё святых.
**Б)** галіна ведаў, якая вывучае развіццё той ці іншай гістарычнай навукі, барацьбу розных напрамкаў у ёй, аналізуе і сістэматызуе літаратурныя крыніцы, прысвечаныя пэўнай тэме.
**В)** урачыстая прамова ў гонар значнай грамадскай падзеі ці героя.
**Г)** від выяўленчага мастацтва.
**Д)** прадмет, знак, сімвал, якія ўвасабляюць пэўную ідэю.

**28.** Дзе знаходзіцца помнік паэме «Тарас на Парнасе»?

**А)** у Гарадку. **Б)** у Мінску. **В)** у Ваўкавыску. **Г)** у Жодзіне. **Д)** у Лідзе.

**29.** У старажытнай рымскай сістэме лічбаў адсутнічаў значок для абазначэння … .

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 3. **Г)** 5. **Д)** 7.

**30.** Хто з вядомых мастакоў слова з'яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Запытай ты сябе, чалавеча:*
*Што зрабіў для айчыны, ці многа?*

**А)** Янка Купала. **Б)** Якуб Колас. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Янка Лучына. **Д)** Алесь Гарун.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218 тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 13200 экз. г. Мінск. 2014 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2014»

*Чацвер, 20 лютага 2014 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтага патрабавання удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Адным з герояў паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» з'яўляецца дзядзька Антось. Пра яго ідзе размова ў радках:

*І пaглядзець было цікава, … на рынку выбірае!*
*Як дзядзька шчыра і ласкава Якіх ён спроб там ні ўжывае!..*

Што так старанна выбіраў дзядзька Антось?

**А)** шапку. **Б)** зерне. **В)** муку. **Г)** касу. **Д)** падарункі.

**2.** Вызначце з прыведзеных словы-паронімы:

*1) будова – будоўля; 2) бурачковы – бурачны;*
*3) дзейны – дзейсны; 4) забеспячэнне – забяспечанасць.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**3.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы:

*1) дэрманцін; 2) масціка; 3) цвесці; 4) рэйтынх; 5) дойліцтва.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**4.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***й***?

*1) за..грацъ; 2) за..нецъ; 3) пера..менавацъ.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**5.** Якое лексічнае значэнне адпавядае ўстойліваму спалучэнню ***як агню ўхапіўшы***?
**А)** ‘вельмі многа чаго-небудзь’.
**Б)** ‘вельмі хутка’.
**В)** ‘выказаць сваё незадавальненне чым-небудзь’.
**Г)** ‘пра што-небудзь вельмі прыгожае, прывабнае’.
**Д)** ‘з любога пункту гледжання’.

**6.** Які лічэбнік прапушчаны ў народным выслоўі?
*Увакруг – адзін круг, а нацянькі … дзянькі.*
**А)** два. **Б)** тры. **В)** чатыры. **Г)** два пятыя. **Д)** чатыры шостыя.

**7.** Вызначце сказ, у якім дзеяслоў запісаны няправільна:
*1. Бабуля хуценька пакрышыла бульбу.*
*2. Дзяўчынка аж засаромілася ад пахвалы родзічаў.*
*3.Усё ж такі прытамілася кабета ў дарозе.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**8.** Якія прыметнікі з дадзеных не ўтвараюць ніякіх формаў ступеняў параўнання?
*1) сціплы; 2) гнуткі; 3) сонны; 4) бронзавы.*
**А)** усе дадзеныя прыметнікі. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**9.** Як называецца трапічнае дрэва, абястлушчаныя зярняты якога ідуць на прыгатаванне шакаладу?
**А)** манга. **Б)** какава. **В)** бамбук. **Г)** баабаб. **Д)** магнолія.

**10.** Выберыце з дадзеных сказы, у якіх на месцы пропуску неабходна ўставіць часціцу ***ні***:
*1. Аб правілах бяспекі вучням нагадвалі … раз.*
*2. Сябры з’ехалі з гары … раз, а чатыры разы.*
*3. … адзін чалавек не адмовіўся дапамагчы пацярпелым.*
*4. Дыктар … разу не памыліўся.*
**А)** усе сказы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**11.** Вызначце правільна напісаныя словазлучэнні:
*1) грэцкая мука; 2) грэчкавы пах; 3) грэцкае мастацтва; 4) грэчаскі арэх.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Выберыце правільнае меркаванне, якое характэрна для службовых часцін мовы:
*1) з’яўляюцца членамі сказа; 2) маюць граматычныя катэгорыі; 3) не змяняюцца.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**13.** Якія назоўнікі з дадзеных няправільна ўжыты ў форме множнага ліку назоўнага склону?
*1) каменні; 2) вяселлі; 3) вуголлі; 4) плацці; 5) пакаленні.*
**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**14.** Вызначце словазлучэнні, у якіх парушаны сінтаксічныя нормы:
*1) вярнуцца на вахту за ключамі; 2) перамяніцца к лепшаму;*
*3) напісаць сцэнарый паводле рамана; 4) засцерагчы ад небяспекі.*
**А)** ва ўсіх словазлучэннях. **Б)** усе словазлучэнні напісаны правільна.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** У якім сказе правільна пастаўлены знакі прыпынку?
*1. Хлапчук заўважыў каля елкі маленькага, калючага вожыка.*
*2. Хочаш, не хочаш, а вучыцца трэба старанна.*
*3. Малыя прачнуліся ні свет ні зара, пачалі будзіць усіх у хаце.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** ва ўсіх сказах дапушчаны памылкі. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**16.** Вызначце словы, якія правільна падзелены для пераносу:
*1) ад-жаць; 2) дожд-жык; 3) вазь-му; 4) да-йсці; 5) сло-ўнік; 6) ЮНЕ-СКА.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 5, 6.

**17.** Выберыце з прапанаваных слоў толькі лічэбнікі:
*1) адна сёмая; 2) паўсотні; 3) дзявяцера; 4) трыццатка; 5) удвая.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**18.** Якія словазлучэнні з прапанаваных напісаны правільна?
*1) прывабнае пані; 2) круглы бельведэр; 3) гандлёвае аташэ;*
*4) характэрнае амплуа; 5) зялёнае альяс.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**19.** Вызначце род складанага назоўніка *гама-спектрометр*.
**А)** дадзены назоўнік не мае роду. **Б)** мужчынскі род. **В)** жаночы род.
**Г)** ніякі род. **Д)** агульны род.

**20.** Якой часцінай мовы з’яўляюцца словы ***брава! алё! ура!***?
**А)** назоўнік. **Б)** прыслоўе. **В)** злучнік. **Г)** часціца. **Д)** выклічнік.

**21.** Выберыце з прапанаваных зычныя гукі, якія маюць парныя мяккія.
*1) [ч]; 2) [ж]; 3) [ш]; 4) [р].*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**22.** У якіх словах на месцы пропуску неабходна напісаць раздзяляльны ***ь***?
*1) надлоб..е; 2) канс..ерж; 3) іл..сніцца; 4) саф..ян; 5) він..етка.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 5.